*Да Дня Перамогі*

# ПРАБАЧЦЕ НАС, ВЕТЭРАНЫ

Набліжаецца 9 Мая — Дзень Перамогі. Многае ў наш цяперашні бурны і складаны час пераасэнсоўваецца, у тым ліку і святы, якія мы на працягу дзесяцігоддзяў урачыста адзначалі і якімі ганарыліся. А цяцер дні, якія былі пазначаны ў календары чырвоным колерам, сталі простымі буднямі. Але значнасць свята Перамогі, як бы ні стараліся яе зменшыць асобныя зацікаўленыя ў гэтым людзі, застаецца. Аб гэтым і вершаваныя радкі А. Твардоўскага:

Есть имена и есть такие даты, —
Они нетленной сущности полны.
Мы в буднях перед ними
виноваты, —
Не замолить по праздникам
вины...

Мільёны аддадзеных чалавечых жыццяў за свабоду і незалежнасць ад фашысцкага рабства з рахункаў гісторыі выкрасліць нельга.

Час расстаўляе ўсё па сваіх месцах: многае «тайное становится явным» — цяпер нам вядомы некаторыя факты з гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, якія старанна замоўчваліся, каб надаць больш бляску, глянцу, узнёсласці перамогам Савецкай Арміі ў час другой сусветнай вайны, зменшыць лічбу сапраўдных яе чалавечых ахвяр. Але не віна ў гэтым тых салдат, якія ўступалі ў няроўную схватку з ворагам і перамагалі, дзякуючы сваёй самаадданасці, мужнасці і гераізму.

І горка ім, цяпер ужо сівым ветэранам, маючым шматлікія ўзнагароды за баявыя заслугі, бачыць сёння, як тое, што было для іх па-сапраўднаму святым, ператвараецца ў прадмет гандлю і нажывы. Ордэны і медалі, за якія яны пралівалі сваю кроў, бессаромна скупляюцца і выгадна збываюцца сучаснымі дзялкамі ад чорнага бізнесу.

Баліць сэрца і душа ў ветэранаў і з прычыны таго, якім стала наша сённяшняе жыццё. Братэрства розных народаў СССР, якое на палях баёў Вялікай Айчыннай дапамагала ў барацьбе з ненавісным ворагам, цяцер перарасло ў нацыянальнае размежаванне і нават адкрытую варожасць. Нялёгка жывецца ветэранам не толькі маральна, але і матэрыяльна: прывілеі, якія яны па праву заслужылі, «з'ядае» інфляцыя.

Дык ці дзеля такога жыцця ваявалі яны, пралівалі кроў? Што ім сказаць у адказ? Нам застаецца толькі нізка схіліць галаву перад іх гераізмам, мужнасцю, праяўленымі ў тыя далёкія і суровыя 1941—1945 гады, і сказаць: «Прабачце нас, дарагія ветэраны...».


# Гомельскі універсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 9 (852) | Аўторак, 4 мая 1993 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана 1 руб.


## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

У мінулы чацвер адбылося чарговае пасяджэнне вучонага савета універсітэта. Па дакладу дэкана гісторыка-юрыдычнага факультэта дацэнта М. І. Старавойтава абмеркавана пытанне аб перспектывах развіцця спецыяльнасці «Правазнаўства».

Вучоны савет зацвердзіў рашэнне конкурснай камісіі па правядзенню Скарынаўскіх чытанняў, якія адбудуцца ў гэтым месяцы. Да іх дапушчаны загадчыца кафедры беларускай мовы дацэнт **А. А. Станкевіч,** дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі **С. Ф. Каморнікаў,** прафесар кафедры вышэйшай матэматыкі **Ю. У. Малінкоўскі,** асістэнт кафедры оптыкі **І. М. Ахраменка,** дацэнт кафедры оптыкі **У. А. Пенязь** і дацэнт кафедры агульнай фізікі **У. Ф. Шолах.**

Да Скарынаўскіх чытанняў дапушчана таксама работа «Мова прадмоў і пасляслоўяў Ф. Скарыны і яго паслядоўнікаў» выпускніка ГДУ дырэктара Капаткевіцкай сярэдняй школы Петрыкаўскага раёна кандыдата філалагічных навук **А. В. Солахава.**

Па конкурсу на вакантныя пасады выбраны прафесарска-выкладчыцкі састаў. **У. М. Сабаленка** абраны загадчыкам кафедры рускай літаратуры на новы тэрмін, **М. В. Родчанка** — дацэнтам гэтай жа кафедры. Доктар філалагічных навук **Р. М. Казлова** выбрана на пасаду прафесара кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства. На пасаду дацэнта кафедры эканамічных тэорый выбраны **Г. Д. Ветлугаеў.** На пасаду старшага выкладчыка кафедры матэматычных праблем кіравання выбраны кандыдат фізіка-матэматычных навук **С. П. Жогаль.**

Вучоны савет зацвердзіў палажэнне аб НДС, прыняў рашэнне аб адкрыцці з новага навучальнага года на факультэце фізічнай культуры кафедры лячэбнай фізічнай культуры, прыняў рэкамендацыі аб выданні прац, выкананых на кафедры педагогікі і псіхалогіі, разгледзеў некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.





## ЯК ПАЧАЦЬ СВАЮ СПРАВУ?

Наша рэспубліка пастутова ўваходзіць у рыначную свабодную эканоміку. Вялікую цікавасць уяўляе малы бізнес, што канкурырые на ўсіх рынках з гігантамі, якія апранапі нас у аднолькавае адзенне, кармілі па тыповаму ляніваму варыянту і яшчэ працягваюць гэта рабіць, хаця стаяць на мяжы банкруцтва. Чаму ж так марудна арганізуюцца малыя прадпрыемствы? Як пачаць сваю справу? Якім неабходна быць спецыялістам, каб арганізаваць эфектыўна працуючае прадпрыемства? Як перадаць свой вопыт іншым?

На ўсе гэтыя пытанні мы атрымалі адказы ў час сустрэчы з доктарам з Канады Харальдам Фінчам. Расказваючы аб сваіх дзіцячых гадах, вучобе ў каледжы, рабоце ў праграме «Апалон», прэзідэнцтве ў каледжах, якія рыхтуюць менеджэраў, наш калега Х. Фінч сцвярджае, што ў кожнага павінна быць мара, якую неабходна ажыццявіць. Пры гэтым не выключаны памылкі, але, набіраючыся вопыту, вы ў канчатковым выніку можаце стаць добрым кіраўніком. Многія яго таварышы па навуковай рабоце не здолелі стаць бізнесменамі, таму што былі проста вучонымі. А патрэбен яшчэ энтузіязм у вырашэнні праблемы. Праблемы ж ёсць у любой краіне, горадзе, сям'і. Вы рэалізуеце свае магчымасці як асоба, калі дабіваецеся пастаўленай мэты. Аказваецца, да 90% людзей не могуць правільна выкарыстаць свае рэзервы. Іх трэба навучыць зразумець сябе, акрэсліць праблему, справу, якія б яны асвоілі і, прыклаўшы свае здольнасці, арганізавалі эфектыўны бізнес у сваім відзе дзейнасці.

Працаваць заўсёды цяжка, і таму многія беспрацоўныя не хочуць ісці ў бізнес. Але каб добра працаваць, неабходна добра вучыцца, сіла могзу мацнейшая за любую ЭВМ. На думку нашага калегі, ёсць тры універсальныя ключы, якія дапамагаюць стаць добрым бізнесменам: мара, якая дазваляе будучае зрабіць лепш за мінулае; бачанне, жаданне рашыць праблему, а значыць, дакладна вызначыць накірунак дзейнасці, каб дабіцца выніку (гэты ключ умоўна яшчэ быў названы чуццём); чэсная работа з кліентамі і калегамі.

Прыезд у Беларусь — даўняя мара Харальда Фінча, які шмат падарожнічае з мэтай вывучэння праблемы рынку. Ён лічыць, што ў нашых гарадах ёсць вялікія магчымасці і праблемы, якія можна вырашаць разам, а ключы да поспеху — аднолькавыя. Галоўны дэвіз амерыканцаў напісаны на манетах — «Мы верым у Бога!».

Абмен думкамі быў свабодным, усе былі ажыўлены. Аказалася, што для стварэння малога прадпрыемства патрэбна ўсяго толькі 2 тысячы долараў і добрыя людзі-аднадумцы — 4—6 чалавек. Каб быць бізнесменам, трэба быць вечным студэнтам — лічыць Х. Фінч.

**Э. ЛІЗАРАВА,**
**асістэнт кафедры эканомікі і сацыялогіі працы.**
Фота **У.** Чысціка.

## ЗАЦВЕРДЖАНЫ КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР

21 красавіка адбылася канферэнцыя працоўнага калектыву універсітэта. На парадку дня стаяла адно пытанне: абмеркаванне праекта і зацвярджэнне калектыўнага дагавору. Тэкст яго праекта, які быў апублікаваны ў папярэднім нумары нашай газеты, зачытаў старшыня прафкома Г. І. Варатніцкі. Пры абмеркаванні ў праект былі ўнесены папраўкі і дапаўненні, пасля чаго дагавор зацверджаны аднагалосна.

На канферэнцыі выступіў рэктар член-карэспандэнт АН Беларусі Л. А. Шамяткоў. Ён гаварыў аб некаторых праблемах, якія цяпер стаяць перад вышэйшай школай, і аб задачах універсітэцкага калектыву.

## У ВІЦЕБСК, НА ФЕСТЫВАЛЬ

З сённяшняга дня па 10 мая г. Віцебск будзе гасцінна прымаць удзельнікаў II студэнцкага фестывалю ВНУ Беларусі. Яго арганізатарамі сталі: камісія па справах моладзі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрствы адукацыі, культуры нашай рэспублікі, Белсаўпроф, Асацыяцыя прафсаюзных арганізацый студэнтаў і навучэнцаў і Асацыяцыя па фізічнай культуры і спорту рэспублікі.

Студэнцтва Гомельшчыны ў Віцебску будуць прадстаўляць 170 юнакоў і дзяўчат усіх ВНУ вобласці. 100 чалавек — студэнты нашага універсітэта. Гэта ўдзельнікі вядомых творчых мастацкіх калектываў ГДУ: танцавальнага ансамбля «Радзімічы», тэатра «Люстэрка», харавой капэлы «Дзянніца», СТЭМа, фальклорнай групы і інш.

Спонсарамі студэнцкай дэлегацыі нашай вобласці сталі аблвыканком, выканаўчыя камітэты Цэнтральнага і Чыгуначнага раёнаў г. Гомеля, якія выдзелілі на аплату за пражыванне, харчаванне і транспартныя расходы каля трох мільёнаў рублёў.

Сумесным рашэннем рэктарата і прафкома студэнтаў ГДУ кожны наш ўдзельнік фестывалю пасля вяртання з яго будзе заахвочаны грашовай прэміяй у памеры 4 тыс. руб. з фонду сацыяльнай дапамогі студэнтам універсітэта.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў матэматычнага факультэта горача віншуюць прафесара кафедры алгебры і геаметрыі СКІБУ Аляксандра Мікалаевіча (вучань прафесара Л. А. Шамяткова) з паспяховай абаронай у Інстытуце матэматыкі АН Рэспублікі Беларусь дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.

# 5 МАЯ — ДЗЕНЬ ДРУКУ

Гэта дата ў календары чырвоным колерам не выдзелена. І ўсё ж яна адзначаецца як свята шматлікай арміі журналістаў, якія працуюць у розных сродках масавай інфармацыі, пазаштатных аўтараў, паліграфістаў, кожнага, хто не ўяўляе свайго жыцця без друкаванага і эфірнага слова.

Прэса заўсёды была і застаецца на перадавых рубяжах барацьбы за лепшы заўтрашні дзень, несла і нясе ў масы праўду аб радасным і смутным. Змест перыядычных выданняў, радыё- і тэлеперадач асабліва змяніўся ў апошнія гады. Гэта звязана з крайне небяспечным сацыяльна-эканамічным крызісам, развалам былога СССР, абвастрэннем міжнацыянальнай і палітычнай абстаноўкі, рэзкім падзеннем узроўню жыцця людзей і многімі іншымі негатыўнымі з'явамі.

Цяпер за выжыванне змагаюцца не толькі беспрацоўныя і многія мільёны абяздоленых працоўных, але і сама прэса. Ад непамерных цэн на паперу, паліграфічныя паслугі і ад іншых затрат многія выданні даўно сталі стратнымі і, не маючы дзяржаўнай або спонсарскай падтрымкі, закрываюцца.

І ўсё ж як бы цяжка цяпер ні даводзілася, не станем адчайвацца, не страцім аптымізму. Будзем спадзявацца, што з цягам часу і нас напаткае лепшая доля. А таму мы шчыра віншуем з надыходзячым Днём друку ўсіх аўтараў і чытачоў нашай газеты, жадаем ім плённай працы і вучобы і больш актыўнага супрацоўніцтва з «Гомельскім універсітэтам».

## СПОРТ

# ЧЭМПІЁНКІ Ў ДРУГІ РАЗ

Завяршыліся гульні фінальнага турніру чэмпіянату Рэспублікі Беларусь сярод жаночых каманд па гандболу па праграме студэнцкай спартакіяды. Узнагароды аспрэчвалі шэсць мацнейшых каманд: Акадэміі фізічнай культуры і спорту, Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі, Гомельскага і Гродзенскага дзяржаўных універсітэтаў, Брэсцкага педагагічнага і Магілёўскага тэхналагічнага інстытутаў. Гамяльчанкі пераканаўча перамаглі каманды БДПА — 40:18, МТІ — 26:10, БПІ — 47:23, ГрДУ — 37:16. Вельмі напружанай атрымалася гульня нашых спартсменак і студэнтак Акадэміі фізічнай культуры і спорту. Перамаглі мінчанкі — 22:21. У выніку аказалася, што пасля ўсіх сустрэч фінальных гульняў гэтыя абедзьве каманды набралі па 20 ачкоў. Аднак у папярэдняй гульні гамяльчанкі адолелі сваіх грозных саперніц з розніцай у 13 ачкоў і ў іх па выніках дзвюх сустрэч атрымалася лепшая рознасць забітых і прапушчаных мячоў. Гэта і забяспечыла нашым дзяўчатам званне чэмпіёнак, дарэчы, другі год запар, і вышэйшыя ўзнагароды. Трэці прызёр — студэнткі з Гродна — адсталі ад пераможцаў аж на 7 ачкоў.

Вельмі прыемным фактам з'яўляецца і тое, што Асацыяцыя па ручному мячу рэспублікі зацвердзіла нашу каманду (трэнер В. П. Крукоўскі) як базавую для падрыхтоўкі да ўдзелу ў чэмпіянаце свету па гандболу сярод студэнцкіх каманд, гульні якога пройдуць з 20 па 26 чэрвеня 1994 года.

Лепшым іграком завершанага чэмпіянату прызнана капітан каманды ГДУ студэнтка II курса факультэта фізічнай культуры майстар спорту Раіса Цітановіч. Яна ўключана ў зборную нацыянальную каманду Беларусі, якая прымае ўдзел у розыгрышы чэмпіянату Еўропы і 2 мая правяла ўжо першую гульню ў Мінску з камандай Турцыі і атрымала ўпэўненую перамогу.

У заключэнне нагадаем аматарам спорту, што 14 мая г. г. на пляцоўцы лёгкаатлетычнага манежа «Дынама» адбудзецца першая гульня супер-фінала за званне чэмпіёнак рэспублікі паміж камандамі «Політэхнік» (Мінск) і ВВВ «Універсітэт» (Гомель). Гульня пачнецца ў 17 гадзін.

**Б. ВАЛОДЗІН.**

# МЕДАЛІ АСІЛКАЎ

Працягваюцца спаборніцтвы мацнейшых спартсменаў ВНУ рэспублікі па праграме студэнцкай круглагадовай спартакіяды.

У Віцебску прайшлі спаборніцтвы па вольнай барацьбе. Выдатна выступілі студэнты нашага універсітэта на чале з прызёрам Алімпійскіх гульняў у Барселоне заслужаным майстрам спорту СССР Вугарам Аруджавым (52 кг). І на гэтым турніры яму ніхто не здолеў аказаць дастойнае супраціўленне. Вугар заваяваў вышэйшую ўзнагароду. Яшчэ трое выхаванцаў факультэта фізічнай культуры ГДУ ўзняліся на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару. Гэта — майстры спорту Валерый Кандраценка (56 кг), Мікалай Краснапееў (68 кг) і Андрэй Барабанаў (82 кг).

У камандным заліку нашы «вольнікі», якіх рыхтавала да гэтых спаборніцтваў група трэнераў на чале з заслужаным трэнерам Рэспублікі Беларусь А. У. Хатылёвым, упэўнена выйшла на першае месца сярод 15 каманд.

У Мінску адбыліся спаборніцтвы па дзюдо і грэка-рымскай барацьбе. У такім турніры нашы дзюдаісты (трэнер В. А. Унучкін) выступалі ўпершыню і здолелі заваяваць ганаровае трэцяе агульнакаманднае месца. Найбольшы поспех выпаў на долю Алега Майчанкі, які выступаў у вагавай катэгорыі да 71 кг. Ён здолеў заваяваць вышэйшую ўзнагароду.

Каманду па грэка-рымскай барацьбе да спаборніцтваў рыхтаваў С. М. Дзегцяроў. І хоць ні аднаму з нашых студэнтаў не ўдалося заваяваць вышэйшую ўзнагароду, тым не менш яны здолелі заняць шостае агульнакаманднае месца, якое таксама дало заліковыя ачкі ў скарбонку спартклуба.

**В. КАЛЯДА,**
**загадчык кафедры фізічнага выхавання.**

# ПА ПРАГРАМЕ УНІВЕРСІЯДЫ

### СТРАЛЬБА КУЛЯВАЯ

Па выніках праведзеных спаборніцтваў самым меткім ва універсітэце аказаўся чацвертакурснік факультэта фізічнай культуры Дзмітрый Завадскі. У яго 97 ачкоў са 100 магчымых. На тры ачкі адстаў ад яго трэцякурснік геалагічнага факультэта Ігар Трылуцкі, якому ў сваю чаргу ўсяго толькі адно ачко ўступіла Ларыса Серанок — трэцякурсніца біяфака.

У камандным заліку лепшую суму ачкоў — 735 — набралі стралкі эканамічнага факультэта. На 18 ачкоў адсталі ад іх студэнты фізічнага факультэта. Будучыя біёлагі — трэція: 701 ачко.

**Д. ЖАРКОЎ,**
**дырэктар спартклуба.**

### ЛЁГКААТЛЕТЫЧНЫ КРОС

Усяго ў ім прынялі ўдзел 307 чалавек. Дзяўчаты спаборнічалі на дыстанцыі 500 м. Адпаведна I і 2 месцы занялі дзве Таццяны — Казлоўская і Чэпікава з факультэта фізічнай культуры. Ірына Сінельнікава з геалагічнага факультэта была трэцяй.

Амаль такая ж расстаноўка сіл атрымалася і сярод юнакоў, якія спаборнічалі на дыстанцыі ўдвая даўжэйшай. Тут першае і другое месцы дасталіся Уладзімірам — Трацяку і Спрэсаву з факультэта фізічнай культуры і з фізічнага факультэта. З трэцім вынікам пераадолеў дыстанцыю Дзмітрый Святлічны з геалагічнага факультэта.

Каманднае першынство заваявалі лёгкаатлеты факультэта фізічнай культуры. На іх рахунку — 2989 ачкоў. На 460 ачкоў адсталі ад іх студэнты матфака. Трэцяя сума — у эканамістаў: 2283 ачкі.

На жаль, хуткім бегам на гэты раз універсітэцкія лёгкаатлеты не парадавалі.

**Ю. ПРАЦКО,**
**галоўны суддзя спаборніцтваў.**

## ЧАС ДУМАЦЬ ПРА ЛЕТНІ АДПАЧЫНАК

**Жадаючыя правесці свой водпуск у доме адпачынку Адэскага дзяржаўнага універсітэта з 8 па 31 чэрвеня, могуць падаваць заявы ў прафком выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Даведкі па тэл.: 57-19-22.**

## ЗАПРАШАЕМ ЗА ШАХМАТНУЮ ДОШКУ

Супрацоўнік фізічнага факультэта кандыдат у майстры спорту А. А Савёнак на працягу 30 гадоў займаецца складаннем шахматных задач, кампазіцый і эцюдаў. Іх на яго рахунку ўжо каля 160. Многія апублікаваны ў рэспубліканскім друку, абласной газеце «Гомельская праўда». Сёння мы таксама прапануем сваім чытачам, аматарам шахмат, эцюд і задачу А. А. Савёнка, якія былі складзены ім у 1990 годзе.

Адказы прыносьце і дасылайце ў нашу рэдакцыю. Прозвішчы аўтараў правільных адказаў будуць надрукаваны ў газеце «Гомельскі універсітэт».

Белыя пачынаюць і робяць нічыю.

БЕЛЫЯ: Крb8, пп. b2. f6 (3)

ЧОРНЫЯ: Крd6, Сf5, п. c6 (3)

Белыя пачынаюць і даюць мат у 2 хады.

БЕЛЫЯ: Крf2, Фа5, Лh7, Ке3, Кg3, пп. c7, f5 (7)

ЧОРНЫЯ: Крf4, пп. a2, d6, d5, d4, g4. (6)

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў гісторыка-юрыдычнага факультэта, дэканат завочнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне яго дэкану, дацэнту кафедры гісторыі Беларусі МУРАШКУ Міхаілу Нікадзімавічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці МАЦІ.**

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту кафедры нямецкай і французскай моў РАБЕНКА Валянціне Сямёнаўне з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці МАЦІ.**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

**АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ У АСПІРАНТУРУ Ў 1993 ГОДЗЕ**

**з адрывам ад вытворчасці па спецыяльнасцях:**

матэматычная логіка, алгебра і тэорыя лічбаў; матэматычны аналіз; оптыка; геафізіка; фізіка цвёрдага цела; фізіка ядра і элементарных часцінак; батаніка; фізіялогія чалавека і жывёлін; агульная і рэгіянальная геалогія; матэматычнае і праграмнае забеспячэнне вылічальных машын, комплексаў, сістэм і сетак; руская мова; тэорыя і гісторыя педагогікі; тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі і аздараўленчай фізкультуры;

**без адрыву ад вытворчасці па спецыяльнасцях:**

оптыка, аналітычная хімія; батаніка; заалогія; методыка выкладання матэматыкі; тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі і аздараўленчай фізкультуры.

Паступаючыя ў аспірантуру здаюць конкурсныя ўступныя экзамены па філасофіі, замежнай мове і спецыяльнай дысцыпліне ў аб'ёме дзеючай праграмы для ВНУ.

Прыём дакументаў і субяседаванне з загадчыкамі кафедр або мяркуемымі навуковымі кіраўнікамі — да 10 верасня 1993 г.

Заява аб прыёме ў аспірантуру падаецца на імя рэктара з дадаткам: асабістага лістка па ўліку кадраў з трыма фотакарткамі; аўтабіяграфіі; характарыстыкі-рэкамендацыі з апошняга месца працы; копіі дыплома аб заканчэнні вышэйшай навучальнай установы і копіі выпіскі з заліковай ведамасці; спісу надрукаваных навуковых прац, вынаходніцтваў і справаздач аб навукова-даследчай рабоце, а пры іх адсутнасці — рэферата па выбранай навуковай спецыяльнасці; выпіскі з пратакола пасяджэння вучонага савета для асоб, рэкамендаваных у аспірантуру вучонымі саветамі ВНУ (факультэтаў), непасрэдна пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы; пасведчання па форме 2.2 аб здачы кандыдацкіх экзаменаў для асоб, поўнасцю або часткова здаўшых кандыдацкія экзамены; меддаведкі (форма № 086-у); выпіскі з працоўнай кніжкі.

Уступныя экзамены праводзяцца з 1 па 30 кастрычніка 1993 г.

Дакументы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, аддзел аспірантуры; тэл. 56-21-29.

**РЭКТАРАТ.**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНЫХ ПАСАД ПА КАФЕДРАХ:**

— аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі — дацэнта;

— педагогікі і псіхалогіі — прафесара.

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

**Рэктарат.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

«Гомельскі універсітэт» — газета Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Рэгістрацыйны № 221

Спонсары газеты — Цэнтральны райсавет народных дэпутатаў г. Гомеля; НВП «Сучасныя тэхналогіі», прафком студэнтаў.

фабрыка «Палесдрук» г. Гомель, Савецкая, 1.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 282.

Падпісана да друку ў 13.00.